*ІРЫНА КАНАВАЛЬЧЫК*
*(г. Мінск)*

# Адзін з этапаў жыцця ансамбля «Бліскавіца»

Прыступаючы да напісання артыкула пра чалавека, з якім мне давялося ў свой час досыць цесна супрацоўнічаць, я доўга не магла вырашыць, у якой форме падаць матэрыял. Хацелася б расказаць пра яго творчасць, захоўваючы аб'ектыўнасць. І калі выказаць маё меркаванне пра Дудчанку Мікалая Рыгоравіча адным словам, то яно будзе — *неадназначнасць*.

90 гады XX стагоддзя для Беларусі былі часам вялікіх і якасных перамен. Можна па-рознаму трактаваць гэты перыяд — і развал некалі вялікай дзяржавы СССР, і страта каштоўнасных арыенціраў, і эканамічны надлом, і многае іншае.

Але айчыннай гісторыі ўласцівы нейкія парадоксы. У другой палове XVIII стагоддзя распад дзяржавы Рэчы Паспалітай суправаджаўся ўздымам тэатральнай творчасці! (Гэты перыяд развіцця нашага мастацтва вельмі дасканала ўзнавіў у сваіх манаграфіях доктар мастацтвазнаўства Г. І. Барышаў.) Такая ўяўная супярэчнасць — адна з заканамернасцей развіцця мастацкай культуры, пра якую К. Маркс пісаў: «адносна мастацтва вядома, што пэўныя перыяды яго росквіту зусім не знаходзяцца ў адпаведнасці з агульным развіццём грамадства, а такім чынам, гэтак жа з развіццём матэрыяльнай асновы апошняга».

Менавіта ў гэты час у культуры рэспублікі ўзнікаюць калектывы новай фармацыі, створаныя не рашэннем адпаведных дзяржаўных органаў, зверху, а па ініцыятыве захопленых людзей, якія мараць прыўнесці ў мастацтва сваё слова, не абапіраючыся на нейкія аўтарытэты. Ствараюцца першыя недзяржаўныя прафесійныя калектывы, гатовыя на рызыкоўныя эксперыменты. Толькі ў адным Мінску былі створаны: «Альтэрнатыўны тэатр» пад кіраўніцтвам В. Грыгалюнаса, харэаграфічны ансамбль «Забава», арганізаваны С. Шадзюном, аркестр народных інструментаў «Менск» пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Я. Глебава і ансамбль музычных і харэаграфічных мініяцюр «Бліскавіца», стваральнікам якога з'яўляецца аўтар гэтага артыкула.

Дзеля стварэння калектыву неабходна было знайсці людзей, якія валодаюць пэўнай уладай і магчымасцямі, якія паверылі б у такую неверагодную задуму і дапамаглі ў яе ажыццяўленні. Такімі людзьмі, якія сыгралі вялікую ролю ў станаўленні і жыцці ансамбля «Бліскавіца», сталі А. Х. Шкляр, які займаў у той час пасаду дырэктара звычайнага СПТВ № 115 г. Мінска, неардынарная асоба, і галоўны фінансіст — В. Б. Карнюшкова.

Я апускаю даволі вялікі раздзел аб падрыхтоўчым этапе, праведзеным для пачатку творчай дзейнасці калектыву. Скажу адно, што адначасова са стварэннем праграмы ішло добраўпарадкаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы: будаваліся тэатральная зала на 350 пасадачных месцаў, харэаграфічная зала, аркестравы клас, касцюмерная; шыліся касцюмы і абутак, набываліся інструменты і інш.

Афіцыйнай датай стварэння ансамбля лічыцца 27 чэрвеня 1991 года. У арсенале балетнай групы былі харэаграфічныя мініяцюры: «Жарты з брылямі» — вясёлыя беларускія скокі, у якіх хлопцы спрабуюць забраць свае капелюшы ў дзяўчат, і ўдачліваму належыць пацалунак; «З кірмашу» — харэаграфічная карцінка, якая з гумарам расказвае пра ўзаемаадносіны на базары; «Вярбічанька» — лірычны танец, дзе вобраз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай дзяўчыны асацыіруецца з маладой вярбой; «Рэшатуха» — беларускі традыцыйны гульнявы танец; грацыёзная і шляхетная «Навасельская кадрыля», тэмп якой ад фігуры да фігуры паступова павялічваўся і даводзіўся да плясу, але пры гэтым захоўвалася стрыманая манера выканання; гарэзлівая і бойкая беларуская полька «Рахцях-цях» з арыгінальнай лексікай.

Акрамя займальнага сюжэта і арыгінальнай лексічнай састаўляючай, усе танцавальныя нумары мелі даволі цікавую аранжыроўку. Музычны кіраўнік ансамбля В. С. Васіленя і кампазітар-песеннік А. П. Балотнік тонка адчувалі спецыфіку беларускай музыкі, і гэтая якасць дазволіла ім таленавіта аранжыраваць народныя песні і мелодыі, самім ствараць музычныя нумары, пісаць аўтарскія песні, поўныя нацыянальнага духу: «Беларускія найгрышы», полька «Фенька», «Каленцы на паленцах», «Бацянка», «У Яніны імяніны», «Сказаў, як звязаў», «На вуліцы грымата», «Першыя маразы», «Еўфрасіння» і г. д.

У снежні 1991 года ансамбль атрымаў запрашэнне Прэзідэнта Еўрапейскага Парламента на гастролі ў Еўропу і пасля ўдалых выступленняў стаў пастаянна ўдзельнічаць у творчых праектах, якія праводзіліся за мяжой.

Калектыў пачынаюць заўважаць і на радзіме, хаця працэс прызнання ішоў вельмі цяжка. Даводзілася прыкладаць вялікія намаганні, каб заняць нейкую нішу ў шчыльна складзенай структуры.

30 кастрычніка 1992 года ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбыўся канцэрт, прысвечаны святкаванню 110-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа. Маладому рэжысёру Н. В. Осіпавай прыйшлася па душы наша самабытнасць, і яна не пабаялася ўключыць выступленне ансамбля ў канцэртную праграму разам з масцітымі дзяржаўнымі калектывамі.

Менавіта там, на генеральным прагоне, адбылася наша першая размова з М. Р. Дудчанкам.

Ён ніколі не лічыўся перыферыйным спецыялістам у галіне танца. Наадварот, імя Дудчанкі асацыіравалася з вялікімі дзяржаўнымі маштабнымі мерапрыемствамі і святамі, што праводзяцца на самых прэстыжных пляцоўках гарадоў Беларусі. За ім укаранілася слава моднага рэжысёра, цікавага пастаноўшчыка, стваральніка і балетмайстра першай праграмы вядомага ансамбля «Харошкі», які ў гэты час стаяў у авангардзе харэаграфічнага мастацтва Беларусі і славіўся сярод аматараў тэрпсіхоры своеасаблівым эталонам. Дудчанку лічылі таленавітым, але амбіцыйным чалавекам, здольным адстойваць свой пункт гледжання і даволі рэзка крытыкаваць супрацьлеглае меркаванне. К гэтаму часу ён пакінуў «Харошкі» і займаўся, у асноўным, пастановачнымі праектамі ў якасці рэжысёра.

Мікалай Рыгоравіч падышоў да мяне з пытаннем, ці ведаю я, хто ён такі. Пасля сцвярджальнага адказу пачаў распытваць пра калектыў, яго статус, колькасны склад і рэпертуар, а ў канцы размовы — віншаванні з тым, што «нарэшце ў рэспубліцы з'явіўся арыгінальны і самабытны калектыў са сваім тварам і творчым почыркам». Яго ацэнка ўбачанага была вельмі пахвальнай і прыемнай. Увечары, пракруціўшы нашу размову некалькі разоў, я прыняла канчатковае рашэнне — запрасіць яго ў якасці балетмайстра ў ансамбль. Акрамя таго, было велізарнае жаданне і цікавасць папрацаваць з такім спецыялістам, як М. Р. Дудчанка.

Скажу шчыра, ініцыятыву запрашэння новага балетмайстра ў калектыве ўспрынялі неадназначна — ад поўнай падтрымкі, да поўнага адмаўлення, але пераважыў аргумент яго вядомасці і надзея, што з сувязямі М. Р. Дудчанкі перад намі адчыняцца ўсе дзверы і нам будзе прасцей і лягчэй працаваць у Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праца над новай праграмай пачалася і з энтузіязмам. Мікалай Рыгоравіч валодаў дарам пераканання і мог натхнёна маляваць карціны будучых поспехаў. І яму паверылі — ад артыста ансамбля да галоўнага дырэктара і фінансіста.

Былі пашыты і набыты дарагія касцюмы і аксесуары: скураныя рамяні і плеценыя паясы ручной работы, расшытыя пацеркамі жаночыя галаўныя ўборы, двухручныя мячы і жаночыя кінжалы з похвамі, рыцарскія даспехі, харугвы з гербамі беларускіх гарадоў, паўлінавыя пёры для мужчынскіх галаўных убораў, белыя пальчаткі і ўпрыгажэнні. Гэты спіс можна працягваць доўга. Некаторыя гатовыя камплекты былі не да спадобы балетмайстру, і касцюмы перашывалі. Музычны матэрыял і аранжыроўку заказвалі ў вядомых айчынных кампазітараў — В. Раінчыка, Э. Фарберава, С. Хвашчынскага і г. д.

Як і пры падрыхтоўцы першай праграмы, усе працавалі на ідэю, не лічыліся з часам. Акрамя сваіх непасрэдных абавязкаў удзельнікі калектыву дапамагалі шыць новыя касцюмы, кляпалі кальчугі, расшывалі плашчы, падганялі скураныя паясы. Да гэтага часу пры ансамблі была арганізавана шавецкая майстэрня, і «Бліскавіца» стала ўладальнікам унікальнай калекцыі абутку ручной работы, якая магла скласці гонар любому куцюр'е.

«Марш» і «Бой на двухручных мячах», «Мазур-полька», «Крыжачок», «Саўка ды Грышка», «Падэспань», «Ваталінка», «Таўкачы» — гэтыя харэаграфічныя нумары, створаныя М. Р. Дудчанкам, склалі новы рэпертуар танцавальнай групы ансамбля. Са старой праграмы засталіся лірычная «Вярбічанька» і «Вальс-развітанне», пастаўлены мною на музыку С. Хвашчынскага. Некалькі пазней рэпертуар папоўнілі новыя пастаноўкі: беларускі танец «Крутуха», яўрэйскі танец «У Траецкім прадмесці» і «Грэчаская рапсодыя» на музыку М. Тэадэракіса.

Хтосьці мудры сказаў, што кніга ўяўляе сабой друкарскі адбітак аўтара. Гэтае сцвярджэнне так жа ўласціва балетмайстру і створаным ім творам. Калі паспрабаваць вызначыць харэаграфічны стыль пастановак Мікалая Рыгоравіча, то, на маю думку, можна правесці нейкую аналогію са стылем барока і маньерызмам.

Адзін з асноўных пастулатаў названых стыляў абвяшчае, што «асновай мастацтва прызнана прыгажосць і самая істотная яе частка — грацыя».

Усе харэаграфічныя нумары, створаныя Мікалаем Рыгоравічам у ансамблі «Бліскавіца», імкнуцца да знешняга бляску і дэкаратыўнасці, каб уразіць гледачоў сваёй вытанчанасцю і манернасцю.

Самы моцны бок балетмайстарскага таленту М. Р. Дудчанкі — праца над самім рухам. Ён здольны адтачыць любое харэаграфічнае *па* і надаць яму нейкую ажурнасць, скласці танцавальную камбінацыю, якая вылучаецца асаблівай элегантнасцю; умее знайсці для кожнага руху выйгрышны ракурс, што стварае адчуванне вытанчанай тэхнікі.

У руху яму важна ўсё — ад правільнай пастаноўкі ног, корпуса, да паставы мезенца на руках. Філіграннасць працы над харэаграфічным тэкстам, калі балетмайстар пры яго складанні патрабуе асаблівай увагі да дробязей і дэталей, і складае той асаблівы стыль. Ствараючы танцавальнае *па*, харэограф акунаецца ў яго і глядзіць на складаючы рух не з аднаго боку, а як бы знутры.

Найлепшы прыклад — харэаграфічная лексіка першай часткі рускага танца «Ваталінка», яўрэйскага танца «У Траецкім прадмесці», «Грэчаскага танца» і беларускага танца «Крыжачок». У гэтых нумарах асабліва праглядаецца стыль Дудчанкі — гранічна выцягнутыя ступні пры любых кроках і ўздымах нагі, падача корпуса ледзь наперад праз маленькі «ўздых», вельмі мяккія кісці рук і дакладная пастава пальцаў, выкарыстанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маленькай хвалі ў корпусе. Ён любіцель цякучых форм і не прызнае сухасці і статычнасці ў танцавальным тэксце.

Валодаючы веданнем прыроды самога руху, пры кампаноўцы камбінацый умее ўлічваць сходнасць і кантраснасць рухаў па тэндэнцыі, выкарыстоўвае злучальныя рухі, што, у канчатковым выніку, прыводзіць да прыгажосці танцавальнага тэксту.

Яшчэ адна адметная рыса стваральнага дару Мікалая Рыгоравіча — уменне разнастаіць рытмічны малюнак руху, выкарыстоўваючы сінкопы, паўзы, прыёмы рапіда, кантрасту. Ён сам, даволі не дрэнна, валодае баянам і фартэпіяна, і веданне асноў музычнай граматы дазваляюць яму ствараць цікавыя танцавальныя рытмаформулы. Яго каронны прыём — перакласці танцавальны рух, складзены на 2/4, на музычны памер 3/4, паводле чаго танцавальнае *па* набывае адчуванне складанасці і віртуознасці.

Але, разам з моцнымі бакамі яго харэаграфічных здольнасцей, на мой погляд, можна адзначыць і пралікі. Адзін з іх — пераважанне формы над зместам.

Захапляючыся складаннем танцавальнага тэксту, М. Р. Дудчанка міжволі сыходзіў ад самой ідэі нумара, і за прыгажосцю і вытанчанасцю танцавальнай мовы, часам губляўся сэнс самога танца. Напрыклад, беларускі танец «Саўка ды Грышка» быў вельмі цікавы сваёй лексікай, пераходамі ад малюнка да малюнка, але яго слабы бок — крыху размытая драматургія.

Сваімі рухамі і манерай выканання рускі танец «Ваталінка» варты ўсялякага захаплення, але яго зацягнутасць, на маю думку, не лепшым чынам адбілася на тэмпарытме нумара ў цэлым.

Беларускія танцы «Крутуха» і «Падэспань», віртуозныя і цікавыя, мелі рэдакцыю блізкую да «харошкінскіх» нумароў.

Танец «Таўкачы» набыў некалькі іншы сэнс, калі яго злучылі ў адзіную кампазіцыю з музычнай п'есай А. Балотніка «Каленцы на паленцах» і саліст аркестра А. Зубко, сваім артыстызмам пры выстукванні на зэдліку, унёс у нумар пэўную долю самабытнасці.

На мой погляд, найбольш цікавым нумарам сярод пералічаных пастановак М. Р. Дудчанкі з'яўляецца беларускі танец «Крыжачок». У новай рэдакцыі ён набыў свецкую элегантнасць, лёгкасць і вытанчанасць, дзякуючы таму, што ў аснове харэаграфічнага тэксту быў пакладзены сінтэз фальклорных танцавальных форм з класічным танцам. «Мазур-полька» адпавядала сваёй назве, а вось «Марш» і «Бой» у поўнай меры цяжка аднесці да чыста танцавальных нумароў, хутчэй гэта былі тэатральна-харэаграфічныя замалёўкі.

Поспех яго творчасці заснаваны не толькі на яго асабістых якасцях, але і на здольнасцях і таленце людзей, якія працавалі разам з ім у ансамблі «Бліскавіца», і якія прымалі самы непасрэдны ўдзел у стварэнні харэаграфічных нумароў. Без выдатнай музыкі кампазітара А. Балотніка не з'явіўся б танец «У Траецкім прадмесці», які стаў адным з самых цікавых нумароў у праграме; таленавітыя аранжыроўкі нумароў «Марш», «Саўка ды Грышка», «Падэспань» В. Васілені падкрэслілі годнасць харэаграфічнай лексікі; мастацкі густ і прафесійны досвед кіраўніка аркестра І. Леўчука дазвалялі агучваць музычны матэрыял на вышэйшым прафесійным узроўні; арыгінальныя ідэі і артыстычны талент А. Зубко прыўносілі ў танцавальныя нумары сваю адметнасць.

М. Р. Дудчанка — неардынарны і цікавы балетмайстар, і гэтага ніхто не адмаўляе. Жыццё дало яму шчаслівы шанец, які не ўсім выпадае — рэалізаваць сябе ў мастацтве ды й тое, што ў адзін з этапаў яго жыццядзейнасці побач з ім знаходзіліся выдатныя людзі — творцы…

Пасля яго сыходу калектыў працягваў паспяхова працаваць і гастраляваць. Акрамя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вялікіх сольных выступленняў на радзіме, канцэртныя залы Германіі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Тайвані, Італіі, Галандыі, Ірака, Польшчы гасцінна раскрывалі свае дзверы. Рэпертуар папоўніўся новымі харэаграфічнымі, вакальнымі і музычнымі нумарамі. Абазначылася канцэпцыя новай праграмы пад назвай «Мелодыі і танцы народаў свету», з якой «Бліскавіца» двойчы станавілася лаўрэатам Міжнароднага фестывалю-конкурсу «Красавіцкая вясна» ў Паўночнай Карэі (1998, 2000), сустракала новае тысячагоддзе на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы Тайваня разам з 25-тысячнай публікай.

Але гэта ўжо іншая гісторыя.

*2013 г., лістапад*

*ЭМИЛИЯ ШУМИЛОВА*

*(г. Москва)*

## «Тот — не художник, который не прибавит миру немножко зоркости»

В честь праздника 855-летия Гомеля и 200-летия его садово-паркового ансамбля Румянцевых–Паскевичей в Белоруссии состоялся Первый Международный фестиваль хореографии.

Танцу была оказана честь стать главным содержанием и украшением исторического праздника.

У танца достаточно возможностей справиться с этой ответственной задачей! Он раскрылся в самом широком диапазоне — от аутентичного обрядового фольклора и его разнообразных сценических обработок до высокого искусства балетного театра, представленного труппами Минска и Санкт-Петербурга. Особую тему составил конкурс современных бальных танцев. Все многообразие хореографического искусства было представлено в масштабном историко-художественном празднике на стадионе: массовые народные танцы, детские танцы, акробатические, спортивные, бальные танцы… и даже танцующие лошадки...

Естественно, что фольклорные коллективы были преимущественно белорусские, народно-сценические разных регионов Белоруссии, России, Украины и даже Шотландии.

Но, признаюсь, самое большое впечатление на меня произвело выступление ансамбля музыкально-хореографических миниатюр «Бліскавіца», руководитель балетной группы — Николай Дудченко. «Бліскавіца» в переводе означает молния, вспышки молнии.

Николай Дудченко стоял у истоков ансамбля «Харошкі». Вместе с Валентиной Гаевой они начинали с фольклора могилевского региона и весьма успешно. Знать, понимать, беречь и приумножать красоту народного творчества Беларуси — счастливая идея в основе богатого репертуара «Харошак». Ансамбль получил широкую известность и международное признание...

Двадцать лет назад Дудченко и Гаевая расстались, и каждый пошел своим путем...

Дудченко в расцвете своего дарования, творит смело, вдохновенно, по праву реализует свой влюбленный взгляд художника на мир, на возможности музыкально-хореографического решения.

Замечательно, что программу «Бліскавіцы» сопровождает живой оркестр, где каждый артист-солист — яркий талантливый музыкант (скрипка, цимбалы, флейта),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ